ТУТ І ЦЯПЕР
WWW.SVABODABY.NET
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
23.12.10-29.12.10 г.

## ПРАДПРЫМАЛЬНІКІ Ў ШОКУ



А ГРОШЫ ЛІЧЫЦЬ ТАК І НЕ НАВУЧЫЛІСЯ

СТАР. 4

## ФАТАЛЬНАЯ ПАМЫЛКА

ПРАЛІКІ БУДЗЕМ ЛІЧЫЦЬ ЯШЧЭ ДОЎГА



СТАР. 5

# ПЕЙЗАЖ ПАСЛЯ ПЛОШЧЫ: СУМУЮЦЬ УСЕ

У апошні момант выбары-2010 ператварыліся ў канец свету. Наступствы, хутчэй за ўсё, будуць кепскімі і для Аляксандра Лукашэнкі, і для апазіцыйных кандыдатаў.




*Далёка не ўсім спадабаліся лічбы ў 80 адсоткаў, якія прагаласавалі за дзеючага прэзідэнта*

У нядзелю ў абед ужо было канчаткова зразумела, што выбары адбываюцца па стандартным сцэнарыі, які прадугледжвае каля 80% выбаршчыкаў, што нібыта аддалі галасы за дзеючага кіраўніка Беларусі. Пра тое, у прыватнасці, сведчылі вынікі экзіт-пулаў, якія агучылі праўладныя арганізацыі. У сваю чаргу апазіцыя атрымала падставы пачынаць пратэсты, не чакаючы афіцыйнага абвяшчэння вынікаў выбараў.

Але ж усё адразу пайшло не па плане. Уладзімір Някляеў не паспеў адысці ад офіса і 100 метраў, як быў збіты да непрытомнасці. З чэрапнамазгавой траўмай яго забрала ў шпіталь "хуткая дапамога".

Вынікі бянтэжылі нават тых, хто не мае ілюзій адносна лукашэнкаўскага ладу: больш за 600 чалавек затрымана, некалькі сотняў моцна збітыя, сямёра з дзесяці кандыдатаў нібыта справакавалі бойку ля Дома ўрада. Такія прэтэнзіі выглядалі, прынамсі, несвоечасовымі.

Цягам прэзідэнцкай кампаніі ўлада ўвесь час імкнулася сутыкнуць ілбамі апазіцыйных прэтэндэнтаў на прэзідэнцкую пасаду. З гэтага амаль нічога не атрымалася. І на табе — ужо пасля выбараў пачалося высвятленне адносін у такім недарэчным варыянце, што дыскрэдытуе апазіцыю нават у вачах яе прыхільнікаў.

Аднак Аляксандр Лукашэнка не выглядаў пераможцам. Падчас прэсавай канферэнцыі кіраўнік Беларусі відавочна нерваваўся, асабліва на пачатку.

**Аляксандр Лукашэнка не выглядаў пераможцам. Падчас прэсавай канферэнцыі кіраўнік Беларусі відавочна нерваваўся, асабліва на пачатку.**

Знікненне Някляева парушыла і без таго хісткі баланс паміж апазіцыйнымі кандыдатамі ў прэзідэнты. Хаця на Кастрычніцкай плошчы сабралася не так мала народу, ніхто з палітыкаў не здолеў утрымаць лейцы ў сваіх руках. Скончылася гэта скамарошным штурмам Дома ўрада і жорсткай расправай у адказ.

Здавалася, куды яшчэ горш? Аднак яшчэ больш дрэннай сітуацыя аказалася раніцай. Адзін з нешматлікіх кандыдатаў, якія засталіся на волі, — Ярослаў Раманчук — распаўсюдзіў заяву, у якой асудзіў Мікалая Статкевіча, Андрэя Саннікава і Віталя Рымашэўскага за тое, што яны зняволены.

*Заканчэнне на стар. 3*

**ВЫБАРЫ-2010**




**Выбары ў Беларусі нельга прызнаць свабоднымі і дэмакратычнымі, заявіў на прэс-канферэнцыі ў панядзелак у Мінску кіраўнік місіі кароткатэрміновых назіральнікаў БДІПЧ АБСЕ Тоні Лойд.**

## АБСЕ: ВЫБАРЫ Ў БЕЛАРУСІ НЕ БЫЛІ ДЭМАКРАТЫЧНЫМІ

«Беларусі яшчэ трэба будзе прайсці вялікі шлях, каб выканаць свае абавязацельствы ў рамках АБСЕ», — сказаў Т.Лойд.

Ён падкрэсліў, што «арышты кандыдатаў у прэзідэнты і прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці і грубы разгон дэманстрацыі будуць з'яўляцца тым бэкграўндам, на якім будуць ацэньвацца гэтыя выбары», — адзначыў ён.

У той жа час прэзідэнт Расіі Дзмітрый Мядзведзеў назваў падзеі ў Мінску справай самой Беларусі, але «для Расіі важна, каб яны адлюстроўвалі суверэнную волю народа», заявіў прэзідэнт Расіі. «Падзеі на выбарах прэзідэнта Беларусі — гэта ўнутраная справа Беларусі», — перадае словы Мядзведзева агенцтва Reuters.

«Я спадзяюся, што ў выніку гэтых выбараў Беларусь працягне развіццё па шляху стварэння сучаснай дзяржавы, заснаванай на дэмакратыі і сяброўстве са сваімі суседзямі», — цытуе Мядзведзева ІТАР-ТАСС.

kamunikat.org

# ШТО НАС ЧАКАЕ ПАСЛЯ ВЫБАРАЎ?

**АЛЕСЬ АНЦІПЕНКА, ФІЛОСАФ:**

## “БЕЛАРУСКАЕ ГРАМАДСТВА ЖЫВЕ НА ІНШЫХ ЧАСТОТАХ. З УСІМІ ВЫНІКАЮЧЫМІ”.

— Я не думаю, што гэтыя падзеі будуць мець нейкі сур’ёзны ўплыў, таму што значная колькасць (калі не большая частка) беларускага грамадства жыве на іншых частотах, на іншай хвалі. Тым больш калі ўлічыць, якую масіраваную апрацоўку вядуць дзяржаўныя беларускія медыя. Так што для большасці людзей тое, што адбылося на Плошчы, будзе прачытана ў той інтэрпрэтацыі, якую ім падаюць. Гэта па-першае. Па-другое: безумоўна, нейкія змены будуць адбывацца. Улады вымушаны будуць нешта рабіць. Найперш у галіне эканомікі. Урад стварае праграму эканамічных рэформ. Трэцяе: калі верыць таму, што паведамляюць медыя, маўляў, дзякуючы падпісанню Мытнага саюза з Расіяй датацыі ў беларускую эканоміку будуць складаць каля чатырох мільярдаў долараў у год, то ўзнікае пэўны гарантаваны запас трываласці.

Таму нічога такога, што магло б сур’езна паўплываць на беларускую сітуацыю, у бліжэйшай перспектыве не назіраецца. Але зразумела, што ў больш аддаленай перспектыве многае будзе залежаць ад таго, як будзе развівацца эканамічная сітуацыя ў Беларусі. І зусім не відавочна, што перспектывы нашай эканомікі бліскучыя.



*Тэлебачанне значна ўплывае на ўспрыманне цяперашніх падзей многімі нашымі грамадзянамі*

**НАТАЛЛЯ, СТУДЭНТКА БДУ:**

## “ХОЧАЦЦА АДЭКВАТНАЙ РЭАКЦЫІ З БОКУ ЕЎРОПЫ”.

— Хочацца верыць, што нарэшце будуць перагледжаныя сумесныя праэкты сённяшняй улады з Еўрасаюзам. Увесь іх “канструктывізм” аказаўся марным. Хочацца спадзявацца, што ЗША ўжо не гарацць жаданнем папрацаваць з Лукашэнкам у галіне атамнай энергетыкі. Хай бы МВФ забыўся на свае абяцанкі льготных крэдытаў. Хай бы кола для манеўру звузілася да немагчымага.

**ФРАНАК ВЯЧОРКА, ЖУРНАЛІСТ:**

## “УСЁ ЗАЛЕЖЫЦЬ АД НАС”.

— Я думаю, што нас чакае сітуацыя, падобная на тую, што склалася ў 2007 годзе: расчараванне вялікай колькасці беларусаў і актывістаў апазіцыі. І ў той жа час спадзяюся, што дэмакратычны рух папоўніцца новымі шчырымі людзьмі. Безумоўна, усё будзе залежаць ад заканчэння паслявыбарнага ўздыму. Альбо Лукашэнка ўсіх пераламае, сваіх апанентаў ператворыць у дысідэнтаў і створыць кішэнных апазіцыянераў, альбо мы ўсё-такі вытрымаем і здолеем завалодаць прыхільнасцю грамадства. Зараз самае важнае, што мае Лукашэнка, гэта кантроль над інфармацыйнай прасторай. І як бы мы ні хацелі, людзі глядзяць БТ і, на жаль, вераць яму.

Лукашэнка больш не будзе аглядвацца на Захад. Пасля таго, што адбылося, ён цалкам звязаны з Расіяй. Ён будзе намёртва прывязаны да Пуцінска-Мядзведзеўскага клана і не выключана, што пакрысе будзе аддаваць беларускія прадпрыемствы. Пазіцыя Захаду будзе ігнаравацца. І зноў жа, калі з Расіяй адбудзецца нейкі канфлікт, тады Лукашэнка выкарыстае палітвязняў для правядзення гандлю імі з захадам.

**АФІЦЫЙНА**

**За Лукашэнку, паводле папярэдніх вынікаў, прагаласавалі 79,67% выбаршчыкаў (5 млн 122 тысяч), пра гэта паведаміла сёння ў Інфармацыйным цэнтры ЦВК старшыня Цэнтрвыбаркама Лідзія Ярмошына.**

**За Рыгора Кастусёва аддалі свае галасы 1,97% выбаршчыкаў, за Аляксея Міхалевіча — 1,2%, Уладзіміра Някляева — 1,77%, Яраслава Раманчука — 1,97%, Віталя Рымашэўскага — 1,1%, Андрэя Саннікава — 2,56%, Мікалая Статкевіча — 1,04%, Віктара Цярэшчанку — 1,08%, Дзмітрыя Уса — 0,48%.**

**Супраць усіх прагаласавалі 6,47% выбаршчыкаў.**

**Па словах Лідзіі Ярмошынай, яўка склала 90,66%, што прыкладна на 2% больш, чым у 2006 годзе.**

**Старшыня Цэнтрвыбаркама таксама паведаміла, што скаргаў па выніках выбараў у ЦВК пакуль не паступала.**

**БЕЛТА**

**ВАЛЯНЦІНА МАЦКО, НАСТАЎНІЦА:**

## “МОЖА ВЫЛЕЗЦІ БОКАМ”.

— У мяне такое адчуванне (прычым яно не падмацавана ніякімі аргументамі, толькі пачуццямі), што гэты чацвёрты тэрмін можа вылезці Аляксандру Лукашэнку бокам. Эканоміка знаходзіцца, мякка кажучы, не ў самым лепшым стане.

**СЯРГЕЙ ХАРЭЎСКІ, МАСТАЦТВАЗНАЎЦА:**

## “У СТАНЕ ЎЛАДЫ НЯМА ТЫХ, ХТО ДУМАЎ БЫ КАТЭГОРЫЯМІ ПАКАЛЕННЯ”

— Нас чакае пацяпленне клімату, таму я чакаю ранняю вясну і спякотнае лета. Таксама не трэба быць празорцам, каб прадбачыць пагаршэнне адносін паміж Беларуссю і Захадам. У тым ліку з блізкімі суседзямі. Тое, што адбылося, шакіравала многіх. Здавалася, што падзеі 1996 года не паўторацца. Але… Тым не менш, я не бачу нагоды для дэпрэсіі. Ёсць перажыванні за тых людзей, якія апынуліся зараз за кратамі, але тая моладзь, што была на Плошчы, захапіла сваім пачуццём перавагі. Яна атрымала першае баявое хрышчэнне.

Пры гэтым, я не думаю, што нешта радыкальна зменіцца ў жыцці кожнага з нас. Хто пісаў вершы, той будзе і далей пісаць іх. Хто маляваў карціны, той будзе маляваць. А поле для дыялога з незалежным грамадствам рэзка звузілася. На тым баку, у лагеры ўлады, фактычна няма крэатыўных людзей. Няма таленавітых асоб. Няма тых, хто думаў бы катэгорыямі пакалення, а не пяцігодкі. Ім патрэбны новыя мазгі…

# ПЕЙЗАЖ ПАСЛЯ ПЛОШЧЫ: СУМУЮЦЬ УСЕ

*Заканчэнне.
Пачатак на стар. 1*

Ён увесь час не чуў пытанняў журналістаў, хаця акустыка ў зале прыстойная. Лукашэнка асабліва падзякаваў сябрам выбарчых камісій (што нядзіўна) і паабяцаў, што гульні ў дэмакратыю скончыліся і наперадзе яго апанентаў чакаюць суровыя дні.

Гэта цалкам верагодна, але для самога Лукашэнкі яны таксама абяцаюць быць далёка не зорнымі. Канфлікт з расійскім кіраўніцтвам перад самымі выбарамі быў прыхаваны пад крамлёўскі дыван, але нікуды не падзеўся. Нават 20 снежня Лукашэнка не ўтрымаўся ад пары кпінаў у бок Расіі. Таму, напэўна, пасля Новага года мы будзем назіраць чарговыя раўнды супрацьстаяння паміж Мінскам і Масквой.

Адначасова такі экзатычны фінал выбараў моцна папсаваў масты, якія наводзіліся ў заходнім кірунку. Місія АБСЕ, якая ўжо рыхтавалася да даволі кампліментарнай справаздачы па выніках выбараў, у апошні момант прызнала іх несвабоднымі і недэмакратычнымі. Адпаведна, поле для манеўраў паміж Расіяй і Захадам у Лукашэнкі звузілася, хаця цалкам і не знікла.

А тут яшчэ на даляглядзе вымалёўваюцца эканамічныя хмары: у 2011 годзе давядзецца расплачвацца за перадвыбарныя фокусы з заробкамі ды іншымі спакусамі для выбаршчыкаў. Праз гэта трэба будзе шукаць грошы ці то на Усходзе, ці то на Захадзе. А тамтэйшыя крэдыторы, хутчэй за ўсё, выставяць розныя непрыемныя ўмовы. Да таго ж непазбежна падскочуць цэны, вельмі верагодная дэвальвацыя беларускага рубля (гэтым разам не аднамомантная, а паступовая).

Мабыць, таму ў Лукашэнкі пасля выбараў і перад Калядамі, мякка кажучы, не вельмі добры настрой.

**ВАЛЯНЦІН СЫЧ**

# ЦІ АДВАЖЫЦЦА ЕЎРАСАЮЗ НА САНКЦЫІ СУПРАЦЬ БЕЛАРУСІ?

Складана сказаць, хто больш здзівіўся нечаканае агрэсіўнаму разгону дэманстрацыі вечарам 19 снежня: Еўрасаюз ці самі беларусы. Бо так доўга выбарчая кампанія ішла як па масле, прагрэс беларускіх улад адзначалі, на яго працяг спадзяваліся.



*Поле для манеўру максімальна звужана*

## ЖОРСТКІ ЎДАР ПА ДЫЯЛОГУ

Ніхто не чакаў такога раптоўнага заканчэння лібералізацыі — у ноч перад абвяшчэннем папярэдняй ацэнкі АБСЕ.

Еўропа, канечне, не маўчыць. Рэакцыя еўраструктур і краін Захаду не прымусіла сябе чакаць, але была, хутчэй, фармальнай.

МЗС Літвы шкадуе, што ўлады Беларусі не забяспечылі грамадзянам сваёй краіны свабоду сходаў і прымянілі сілу супраць дэманстрантаў. Афіцыйны Вільнюс далучыўся да ацэнкі недэмакратычнасці прэзідэнцкіх выбараў.

Міністэрства замежных спраў Польшчы асудзіла "масавае збіццё і затрыманне маніфестантаў на вуліцах Мінска" і заклікала неадкладна вызваліць затрыманых і патлумачыць прычыны збіцця маніфестантаў, палітыкаў і журналістаў, у тым ліку замежных.

Між тым, афіцыйны прадстаўнік урада Германіі Штэфен Зайберт быў больш прамалінейны. Паводле яго слоў, збліжэнне Беларусі і ЕС адкладваецца на няпэўны час, разгон дэманстрацыі стаў "жорсткім ударам" па дыялогу. Далейшыя дзеянні Германіі і Еўропы будуць залежаць ад справаздач назіральнікаў АБСЕ, сказаў Зайберт.

## БЕЛАРУСЬ ІЗАЛЯВАЦЬ НЕ ТРЭБА

Міністр замежных спраў Аўстрыі Міхаэль Шпіндзелегер выказаў шкадаванне, што беларускія ўлады не выкарысталі шанс, які прадаставілі выбары. На яго думку, ЕС павінен абмеркаваць будучую форму адносін Бруселя і Мінска. "Мы не хочам ізаляваць Беларусь, але будзем настойваць на захаванні натуральных каштоўнасцей і правоў", — заявіў кіраўнік аўстрыйскага МЗС.

У сваю чаргу прадстаўнік АБСЕ па пытаннях свабоды СМІ Дуня Міятавіч сказала, што любы прагрэс у рамках выбарчага працэсу быў перакрэслены брутальнасцю праваахоўных органаў. Па яе словах, міліцыя павінна дапамагаць асвятляць публічныя падзеі, а не збіваць журналістаў.

Ад імя Савета Еўропы яго генсакратар Торб'ерн Янгланд адзначыў, што развіццё сітуацыі ў Беларусі можа азначаць страту магчымасці спыніць ізаляцыю краіны ў Еўропе.

## УСЁ ВЫРАШЫЦЦА 31 СТУДЗЕНЯ?

Беларускі палітолаг Аляксандр Лагвінец у гутарцы з Naviny.by адзначыў, што ў выніку снежаньскіх перамоў з Расіяй аб пастаўках газу і нафты беларускія ўлады вызначыліся з вектарам развіцця і ў адказ на асабістыя гарантыі могуць пайсці на максімальнае збліжэнне з усходнім суседам, у прыватнасці, на ўвядзенне расійскага рубля.

Па словах Лагвінца, адносіны з ЕС перажываюць чарговы віток спіралі ўніз, і абмежавальных мер з боку Бруселя Мінску не пазбегнуць. Так, можа быць зніжаны ўзровень кантактаў і ўведзены візавыя санкцыі ў адносінах да кіраўнікоў выбарчых камісій, дзе былі зафіксаваны фальсіфікацыі.

31 студзеня ў Брусэлі пройдзе пасяджэнне міністраў замежных спраў краін ЕС, на якім будзе разгледжана і сітуацыя ў Беларусі. Верагодна, тады ж можа быць прынята і нейкае рашэнне аб перспектывах дыялога. Калі меркаваць па першай рэакцыі на падзеі 19 снежня, то ЕС расчараваны, але не настолькі, каб сячы з пляча.

**МАРЫНА РАХЛЕЙ, NAVINY.BY**

### ДА ВЕДАМА

Падчас акцыі пратэсту 19 снежня было затрымана больш за 600 чалавек. Вельмі многа дэманстрантаў было збіта. Фізічна пацярпелі 22 журналісты, яшчэ 24 журналісты былі затрыманы міліцыянтамі. Частка з іх адпушчана, частка атрымала пакаранне ў выглядзе "сутак" на Акрэсціна, а яшчэ частка знаходзіцца ў следчым ізалятары КДБ.

Акрамя таго, па інфармацыі ГУУС Мінска, следчым упраўленнем папярэдняга расследавання ГУУС Мінгарвыканкама арыштаваны 19 асоб, якія падазраюцца ў дачыненні да здзяйснення злачынства, што прадугледжана артыкулам 293 КК РБ (масавыя беспарадкі). Усе падазроныя ўтрымліваюцца пад вартай у следчым ізалятары КДБ Рэспублікі Беларусь. Сярод іх былыя кандыдаты ў прэзідэнты Уладзімір Някляеў, Аляксей Міхалевіч, Віталь Рымашэўскі, Андрэй Саннікаў і Мікалай Статкевіч.

ТУТ
WWW.SVABODABY.NET

# ФІНАЛ ВЫБАРАЎ НАПАЛОХАЎ ПРАДПРЫМАЛЬНІКАЎ

**Шакіруючы фінал кампаніі па выбарах прэзідэнта прадстаўнікі малога і сярэдняга бізнесу ўспрынялі з асцярогай. Заканчэнне палітычнай лібералізацыі, на іх думку, цалкам можа азначаць і адкат у лібералізацыі эканамічнай.**



*Прадпрымальнікам цяпер цяжка выпрацоўваць доўгатэрміновыя праграмы*

## ПАЧНУЦЬ ЗАКРУЧВАЦЬ ГАЙКІ?

Асцярогу з нагоды закручвання гаек пасля прэзідэнцкіх выбараў бізнесоўцы выказвалі яшчэ за некалькі месяцаў да 19 снежня. Старшыня каардынацыйнай рады прадпрымальнікаў Беларусі Анатоль Змітровіч падкрэсліваў у інтэрв'ю Naviny.by, «што звычайна, як толькі заканчваюцца выбары, прымаюцца законы аб узмацненні жорсткасці вядзення бізнесу. Гэта адбываецца сістэматычна».

З такой пазіцыяй пагаджаўся і прадпрымальнік Сяргей Парсюкевіч: «Я думаю, што пасля прэзідэнцкіх выбараў пачнецца адваротнае закручванне гаек. Будуць павялічаны падаткі, арэнда, зноў пачнуць прымяняцца масавыя штрафныя санкцыі. Уладам трэба будзе за чыйсьці кошт напаўняць бюджэт, і малы бізнес першым трапіць пад раздачу».

Інфармацыя аб магчымым павелічэнні ў 2011 годзе ставкі адзінага падатку збольшага пацвердзілі гэтыя асцярогі. Больш за тое, пасля выбараў і жорсткага разгону мітынгоўцаў бізнес задумаўся: «А ці не паляцяць у выніку к чорту ўся задуманая ўладамі лібералізацыя?»

Старшыня РГА «Перспектыва» Анатоль Шумчанка адзначаў, што пры дзеючай уладзе бізнесу складана разлічваць на сур'ёзнае змяненне дзелавога клімату.

У дадзены момант сваю негатыўную лепту ў стан бізнес-клімату ўносяць і апошнія палітычныя падзеі: «Улада зараз стварыла такую атмасферу, пры якой казаць аб тым, што ўсё будзе добра, цяжка.

Затрыманні, арышты, крымінальныя справы ствараюць негатыўны фон для бізнесу ў краіне і для патэнцыяльных інвестараў за мяжой.

Сітуацыю трэба стабілізаваць. Лукашэнка сам казаў, што грошы шуму не любяць.

Трэба спыняць гэты шум, вызваліць затрыманых і арыштаваных, спыніць паляванне на ведзьмаў і, урэшце, спыніць гэтую пародыю на 1937 год. А менавіта тыя далёкія часы мне нагадваюць цяперашнія падзеі: абгавор, асуджэнне пад ціскам. Потым скажуць: "Гэта ворагі народа".

Але ж наша краіна заўсёды вызначалася талерантнасцю, міралюбствам. Трэба імкнуцца менавіта да гэтага».

## НЯМА ПАДСТАВЫ, ЯКАЯ АБ'ЯДНАЕ МАЛЫ БІЗНЕС

Старшыня Асацыяцыі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва Сяргей Балыкін больш аптымістычна глядзіць на бліжэйшую будучыню малога бізнесу.

«Не думаю, што гайкі будуць моцна закручваць. Мне здаецца, па вялікім рахунку і закручваць ужо няма куды. Але і сістэмнай лібералізацыі — сапраўднай, а не выдуманай волі — не будзе. Нейкія кропкавыя несістэмныя акцыі па лібералізацыі, ліквідацыі асобных праблем, — не больш за тое. Складуць тысячы планаў, мерапрыемстваў, распрацуюць праекты, іх потым парэжуць, яны ў выніку выйдуць ва ўсечаным выглядзе і будуць малаэфектыўнымі».

Разам з тым эксперт лічыць, што і масавых акцый пратэсту з боку бізнесоўцаў не будзе. І прычына не ў тым, што на плошчы Незалежнасці 19 снежня ўлады прадэманстравалі сваю здольнасць душыць іншадумства.

«Няма фармальнай падставы, якая магла б аб'яднаць увесь малы бізнес для масавага пратэсту. Акцыі магчымы толькі на лакальным узроўні», — падкрэсліў Балыкін.

**NAVINY.BY**

# РАМАНЧУК АСУДЗІЎ «РАДЫКАЛАЎ»

**А восьмай гадзіне раніцы 20 снежня кандыдат у прэзідэнты ад Аб'яднанай грамадзянскай партыі Яраслаў Раманчук распаўсюдзіў заяву наступнага зместу:**

«19 снежня 2010 года адбылася дэманстрацыя на Кастрычніцкай плошчы Мінска. Дадзенае мерапрыемства планавалася выключна як мірнае выражэнне думкі грамадзян.

На жаль, падчас мітынгу на Кастрычніцкай плошчы М.Статкевіч, А.Саннікаў і В.Рымашэўскі заклікалі людзей і павялі іх на плошчу Незалежнасці. Там імі былі справакаваны беспарадкі і ажыццёўлена спроба захопу будынка Дома ўрада.

Пад пагрозай аказаліся жыцці тысяч чалавек.

Я, кандыдат у прэзідэнты Яраслаў Ра-



манчук, асуджаю заклікі да дзеянняў, якія парушаюць мірны характар правядзення масавых акцый. Падзеі ночы 19 снежня паставілі пад пагрозу жыццё людзей.

А.Саннікаву, падаграванаму ягонай жонкай І.Халіп, вельмі хацелася сарваць далікатны дыялог, які зараджаўся паміж Беларуссю і міжнароднай супольнасцю.

Мы разам з Анатолем Лябедзькам, старшынёй Аб'яднанай грамадзянскай партыі, неаднаразова спрабавалі пераканаць А.Саннікава і М.Статкевіча адмовіцца ад планаў радыкальных дзеянняў, бо я пераканаНы, што рэвалюцыі ў Беларусі руйнуюць дэмакратыю. Масавыя акцыі з ужываннем сілы не здольны стварыць атмасферу для паўнавартаснага грамадскага дыялога».

«Наша Ніва» звярнулася ў штаб-кватэру Аб'яднанай грамадзянскай партыі, каб пераканацца ў праўдзівасці заявы. «Так, заява праўдзівая», — адказалі нам.

**МІКОЛА БУГАЙ, NN.BY**

# А. КУЛІНКОВІЧ: “ФАТАЛЬНАЯ ПАМЫЛКА – ПАХОД ДА ДОМА ЎРАДА…”

**Па Беларускім тэлебачанні круцяць каментары дзеячаў культуры, якія актыўна асуджаюць акцыю, што адбылася на плошчы ў дзень прэзідэнцкіх выбараў.**



Прычым тым, хто сказаў бы хоць слова пра тое, як нахабна паводзілі сябе некаторыя прадстаўнікі праваахоўных органаў, слова не даюць. Як не даюць эфір і тым, хто аддаў свой голас не за Лукашэнку.

Чаму так адбываецца? Якія высновы трэба зрабіць не толькі дзеячам культуры, але і ўсім нам пасля Плошчы-2010? Пра гэта і не толькі мы пагутарылі з **лідарам групы “Нэйра Дзюбель” Аляксандрам Кулінковічам**.

— Таму што мы ў такой краіне жывём, — адказвае Кулінковіч на пытанне аб тым, чаму не ўсім даюць эфір. — Я ўвогуле не ведаю, што адбываецца… Напрыклад, у апошнія дні раптам высветлілася, што нават мае даволі блізкія людзі галасавалі за Лукашэнку. Шчыра кажучы, я проста ў шоку! Гаворачы на прэзідэнцкай мове, гэта тыя “адмарозкі”, якія ў 2006 годзе былі на плошчы, а сёлета… галасавалі за Лукашэнку.

**— А што здарылася за гэты час з людзьмі, што яны так кардынальна змянілі свае погляды?**

— Па вялікім рахунку, амаль усе яны кажуць тое, пра што я думаю. Што вельмі многіх на гэтых выбарах, мякка кажучы, расхалодзіла мноства кандыдатаў. Збянтэжыла, што не было адзінага. На выбары пайшоў натоўп кандыдатаў, і многія разгубіліся, палічылі, што хлопцы проста рвуцца да ўлады, кожны сам для сябе.

**— І вы лічыце, што гэта сур’ёзная нагода, каб прагаласаваць за Лукашэнку?**

— Не, я так не лічу. Проста мяне гэта ўвяло ў засмучэнне. Але для кагосьці гэтая нагода аказалася, відаць, сур’ёзнай. І гэтыя людзі ўздыхнулі і падтрымалі дзеючага кіраўніка дзяржавы.

Што тычыцца тых дзеячаў мастацтва, якія вітаюць перамогу Лукашэнкі, то мне падаецца, што многія з іх шчыра вераць у тое, што гэта так. У нашай краіне, канешне, моцна развіты страх і лізаблюдства, але мне падаецца, што ёсць тыя, хто сапраўды верыць у справядлівасць, патрэбнасць і карыснасць гэтай улады.

**— Цікава, як вы ацэньваеце тое, што адбылося? Цяпер столькі каментарыяў: Лукашэнка і міліцыя кажуць адно, сведкі — іншае…**

— Мне падаецца, што гісторыя з біццём шкла — гэта правакацыя. Гісторыя поўніцца падобнымі штукамі. Але пры гэтым варта адзначыць, што п’яных і адмарозкаў хапала і з таго, і з іншага боку.

**— Так, я таксама бачыла нецвярозых.**

— А ім мора па калена! І правакатары маглі быць і з таго, і з іншага боку. А маглі быць і проста дурні.

На мой погляд, вялікай памылкай было ісці да Дома ўрада. І гэта яшчэ раз прадэманстравала раз’яднанасць апазіцыі. Мне падаецца, што нармальны лідар не зрабіў бы так.

У мяне пасля 19 снежня такое адчуванне, як быццам бы нехта вельмі блізкі памёр… Адчуванне бязвыхаднасці… Разумееце, раней было зразумела, хто правы, а хто вінаваты, прынамсі мне асабіста. А ў гэтай сітуацыі….

**— Тым больш, што штурм Дома ўрада ажыццяўлялі некалькі чалавек. Большасць людзей паводзілі сябе мірна, але ж спецназаўцы гвалтоўна выдалілі ўсіх з плошчы.**

— Так, я лічу, што тых, хто ламіўся ў Дом урада, можна было проста адсекчы. Але калі сам прэзідэнт сказаў, што аддаў загад дзейнічаць жорстка, то… Але зноў жа, я ўвогуле баюся натоўпу. Натоўп — гэта поўная непрадказальнасць, якую потым цяжка нечым апраўдаць. І я проста не разумею, хто ў гэтай сітуацыі вінаваты. Вінаваты і тыя, і другія. Фатальная памылка — паход да Дома ўрада…

**— Памылкай была і адсутнасць выразнага плана аб тым, што рабіць на плошчы.**

— Так. Весці за сабой людзей, частка з якіх проста адмарожаныя… Мой сын кажа: “Тата, чаму ў нашым райне жывуць адны алкаголікі?” Я тлумачу: “Ну як жа толькі алкаголікі? Тут шмат прыстойных людзей жыве, але так атрымліваецца, што менавіта “бухарыкаў” ты бачыш часцей за іншых. У нашым раёне (я жыву ва Уруччы) пражывае 108 тысяч чалавек, а ты бачыш з іх 20, і ў цябе склалася такое ўражанне. Нармальныя людзі проста праходзяць, а гэтыя гучна выказваюцца, у іх альтэрнатыўныя твары. Ты іх не можаш не заўважыць”. Тое ж самае гэты натоўп: там 20 адмарозкаў, а ўражанне складзецца, што іх было 20 тысяч… Я лічу, што такія выпадкі “памяранцавай” рэвалюцыі і бачыў, што п’яных людзей там проста выводзілі, выдалялі з натоўпу.

**— Міліцыя альбо арганізатары акцыі?**

— Самі арганізатары. Там увогуле было забаронена піць. І пра гэта ўсюды казалі: і адно аднаму, і ў гукаўзмацняльнікі: “Ні ў якім разе не быць п’янымі, інакш нас абвінавацяць у тым, што мы п’яныя адмарозкі”. Ва Украіне ўсё было падрыхтавана. А тут быў хаос.

**— Як вы ставіцеся да таго, што адбылося з Някляевым?**

— Ну як я магу да гэтага ставіцца? Як можна ставіцца да таго, што збілі чалавека, што яго амаль выкралі з бальніцы?! Прэзідэнт гаворыць, што задаволены тым, як дзейнічала міліцыя, што дзейнічалі вельмі прафесійна, але, на мой погляд, спецназаўцы паводзілі сябе, мякка кажучы, неадэкватна. Бо прафесіяналы паводзілі б сябе зусім паіншаму.

Калі на тым жа “Басовішчы” адбываецца нейкая бойка, што таксама здаралася некалькі разоў, то ахоўнікі дзейнічаюць там сапраўды прафесійна. Яны імгненна адсякаюць хуліганаў ад усіх астатніх і ціхенька іх выводзяць, а не “мочаць” усё “Басовішча”. І калі б акцыя, што адбылася 19 снежня, была добра падрыхтавана, то, відаць, знайшліся б людзі, якія адсеклі б п’яных і тых, хто паводзіць сябе неадэкватна. І гэта варта было прадугледзець. І калі быў бы адзіны кандыдат, які павёў бы ўсіх на плошчу, то ён паклапаціўся б пра нейкую ўнутраную ахову гэтага апазіцыйнага натоўпу. Думаю, што так павінна было быць, але гэтага не было. Таму вінаваты і тыя, і тыя.

**МАРЫНА МІТ.**

# ЧАМУ АДДАЕЦЦА ПРЫЯРЫТЭТ ХАКЕЙНЫМ ПАЛАЦАМ

**Тыя, хто ва ўладзе, часта паўтараюць: спорт па-за палітыкай. Аднак на справе ў Беларусі ўсё атрымліваецца інакш. "Тут і цяпер" аналізуе палітычны падтэкст айчыннага спорту ў адыходзячым 2010 годзе.**

## ЗА ПЕРАМОГУ НАД РАСІЯЙ

У передвыбарнай прэзідэнцкай кампаніі інтэнсіўней за ўсіх кандыдатаў спартовую тэму выкарыстоўваў Аляксандр Лукашэнка.

5 лістапада прэзідэнт уручаў узнагароды спартоўцам, у прыватнасці, званне заслужанага майстра спорту Беларусі прысвоена тэнісістцы Вікторыі Азаранка і біятланістам Сяргею Новікаву і Дар'і Домрачавай. Біятланісты адзначаны за тое, што сталі медалістамі зімовай Алімпіяды ў Ванкуверы. Азаранка ж не стала ані першай, ані трэцяй ракеткай свету, не выйграла турнір "Вялікага шлема". За што ж такія ўшанаванні?

Аказваецца, за перамогу ў пасрэдным "Кубку Крамля", якая адбылася ў момант жорсткага палітычнага супрацьстаяння паміж Масквой і Мінскам. На цырымоніі ўзнагароджання падчас дабрачыннага матчу Азаранка і першай ракеткі свету датчанкі Каралін Вазняцкі Аляксандр Лукашэнка распавёў:

— Яна не жадала выйграваць: назаўтра пачынаўся турнір у Катары, а там тэмпература +35—+38. Я патэлефанаваў ёй увечары і папрасіў выйграць. Гэта быў палітычны матч. Трэба было прадэманстраваць усёй Расіі, што Беларусь жывая.

Прэзідэнт накіраваў спартоўцы віншавальную тэлеграму, а пасля дабрачыннага матчу ўручыў ёй у ліку іншых падарункаў і сваю хакейную клюшку.

Прыгадалася падобная сітуацыя 2004 года: пасля таго, як Максім Мірны і Уладзімір Ваўчкоў перамаглі расійцаў у сустрэчы Кубка Дэвіса, Лукашэнка спешна прыбыў у футбольны манеж, дзе праходзіў матч, і ўзнагародзіў беларускіх тэнісістаў, нібы вайскоўцаў, халоднай зброяй — корцікамі. Атрымліваецца, што галоўнае для нас у спорце — пабіць Расію.

## ПІЯР НА ГРАНІ ФОЛУ

Узнагароджванне Азаранка і Вазняцкі выглядала падзякай спартоўкам за праяўленую літасць і дабрыню да цяжка хворых дзяцей. Аднак выхад на арэну прэзідэнта Беларусі падчас іх паказнога "паядынку" можна было расцаніць як непрыхаваны перадвыбарны піяр. Тым больш усё гэта адбывалася 19 лістапада, роўна за месяц да прэзідэнцкіх выбараў, у дзень уручэння кандыдатам у прэзідэнты пасведчанняў аб рэгістрацыі.

Лукашэнка, як вядома, у Цэнтравыбаркам (ЦВК) не пайшоў, адправіўшы замест сябе міністра адукацыі Аляксандра Радзькова. У той жа вечар дзяржаўныя тэлеканалы наперабой транслявалі падрабязнасці дзейнняў прэзідэнта падчас дабрачыннага шоу, а невялікі рэпартаж з ЦВК убачылі толькі найбольш цярплівыя.

Праз два дні ў Брэсце перад матчам чэмпіянату краіны па футболе паміж мясцовым "Дынама" і бабруйскай "Белшынай" суддзі і футбалісты выйшлі на поле ў суправаджэнні хлопчыкаў і дзяўчынак, апранутых у футболкі сіняга, чырвонага і жоўтага колераў, на якіх быў намаляваны партрэт Лукашэнкі з надпісам "НАШ прэзідэнт".

У тую жа канву ўпісваецца і ўдзел прэзідэнта ў закладцы першага каменя ў падмурак будаўніцтва футбольнага стадыёна ў Барысаве. Будынак разлічаны на 13 тысяч месцаў і павінен быць пабудаваны да 2013 года. Праз некалькі тыдняў кіраўнік барысаўскага клуба БАТЭ Анатоль Капскі выступіў з "ура"-патрыятычнай прамовай на усебеларускім народным сходзе, праўда, у якасці дырэктара аднайменнага завода.



*Магчыма, трэба рабіць стаўку на жаночы баскетбол замест хакейных палацаў?*

## АДКРЫТЫ ЛІСТ

Адной з самых яркіх падзей для беларускіх аматараў спорту стаў чэмпіянат свету па баскетболе сярод жаночых каманд. Наша зборная пад кіраўніцтвам Анатоля Буяльскага прабілася на планетарны форум у Чэхіі ўпершыню. Дэбютанткі, атрымаўшы пяць перамог у сямі сустрэчах, выйшлі ў паўфінал. І толькі выразна прадузятае судзейства схіліла ў дадатковай пяціхвілінцы вагі ў бок гаспадынь турніру. Але і 4 месца — выдатны вынік, лепшы для беларускіх прадстаўнікоў гульнявых відаў спорту. А Алену Лeўчанку прызналі найлепшай цэнтравой і ўключылі ў сімвалічную зборную свету.

Па вяртанні з Чэхіі беларускі выступілі з "Адкрытым лістом": яны запатрабавалі пабудаваць сучасную трэніровачную базу з гульнявымі і трэнажорнымі заламі, распранальнямі, масажнымі і трэнерскімі пакоямі, медкабінетамі. У звароце таксама ідзецца аб забеспячэнні ўзнаўленчымі прэпаратамі і прэміяльнымі, якія адпавядаюць дасягненням.

Патрабаванне баскетбалістак выглядае абсалютна рэальным. У краіне 25 лядовых палацаў, а гэта вельмі дарагія будынкі, якія, як правіла, сябе не акупляюць з-за вялікіх выдаткаў на лёдаўтварэнне і электраасвятленне. Гульнявыя ж залы міжнароднага ўзроўню ў Беларусі можна пералічыць па пальцах. У Мінску — толькі Палац спорту, але ён выкарыстоўваецца для спаборніцтваў па самых розных відах.

Для абмеркавання прапаноў баскетбалістак стварылі цэлую камісію. Спачатку было абвешчана аб тым, што комплекс пабудуюць у мікраёне "Лошыца". Але цяпер, аказваецца, ніхто нічога будаваць не збіраецца. Пагаворваюць аб тым, што з баскетбалісткамі правядуць "індывідуальныя гутаркі", верагодна, для таго, каб яны "забыліся" аб сваім ультыматуме.

Між тым, здзіўленне з перакосу развіцця спорту ў бок хакея выказаў у адным з інтэрв'ю і галоўны трэнер моладзевай зборнай па футболе Георгій Кандрацьеў.

Прафесіяналы не займаюцца палітыкай, яны проста хварэюць за свае віды спорту. Палітыкі ж ператвараюць спорт у сродак дасягнення асабістых мэт.

**МІХАСЬ МОШЫН**

# ВЕРЫЦЬ, КАБ ПАДНЯЦЦА

26-ці гадоваму Сяргею Осіпаву, які жыве ў Слоніме Гродзенскай вобласці, часта сніцца адзін і той жа сон, у якім ён… ідзе. Самастойна, упэўнена ступаючы нагамі па зямлі. Так, як рабіў увесь час. Альбо большую частку свайго жыцця.



"І так не хочацца прачынацца", — прызнаецца малады чалавек. Бо ў рэальнасці Сяргей не можа самастойна перамяшчацца. Апошнія чатыры гады свайго жыцця ён прыкаваны да інваліднага крэсла.

Дыягназ Сяргея ў медыцынскім асяроддзі гучыць даволі ёміста: траўматычная хвароба спіннога мозгу пасля асколачнага пералому цела С5 пазванка з ударам спіннога мозгу. У маладога чалавека пасля траўмы паралізаваны ногі.

## АДПАЧЫНАК СКОНЧЫЎСЯ ТРАГЕДЫЯЙ

"Я ганю ад сябе ўспаміны 2006 года, калі са мной здарылася трагедыя, падзяліўшы жыццё "да" і пасля", — кажа Сяргей. — Аднак яны часта ўсплываюць у маёй памяці…".

У адзін з летніх дзён таго нешчаслівага года Сяргей — студэнт тэхнікума, прафесійны футбаліст — разам са сваімі сябрамі пайшоў на рэчку купацца.

"Усё адбылося неяк вельмі хутка. Я нырнуў у ваду і адчуў рэзкі боль", — распавядае Сяргей.

Ачнуўся малады чалавек у лякарні. Так адбылося, што нырнуў на мелкаводдзе, атрымаў сур'ёзны пералом хрыбетніка, і, як следства, — параліч.

"Тады здавалася, што яшчэ змагу аднавіцца пасля сур'ёзнай траўмы, але ўрачы былі настроены менш аптымістычна, — кажа Сяргей. — Я інвалід, які не можа самастойна перамяшчацца".

## БАЦЬКА ЗА СЫНА

Каб даглядаць хворага сына, бацька Сяргея, Уладзімір, быў вымушаны звольніцца з працы.

"Мая маці памёрла. Мы з татам жывём разам з бабуляй. У мяне яшчэ ёсць брат, які на дадзены момант служыць", — распавядае Сяргей.

Уладзімір Осіпаў не мае магчымасці на дадатковы заробак, таму што Сяргею патрэбен кругласутачны догляд. Ён не можа пакінуць сына аднаго надоўга.

Так і жывуць Осіпавы на сціплую дапамогу інваліда і бабуліну пенсію.

## НЕ ЗДАВАЦЦА!

Але нягледзячы на ўсе праблемы, сям'я Осіпавых не здаецца. Прычым, па словах бацькі паралізаванага юнака, менавіта Сярожа ўсіх падбадзёрвае, калі становіцца зусім цяжка.

"Калі ў мяне апускаюцца рукі, сын кажа: "Тата, не сумуй! Усё будзе добра", — кажа Уладзімір. — І пасля яго слоў разумееш, што ў нас няма іншага шляху".

Для таго, каб трымаць сябе ў добрай фізічнай форме, Сяргей штодня займаецца фізкультурай: трохгадзінны штодзённы комплекс практыкаванняў каля шведскай сценкі, адмысловыя трэнажоры, гантэлі.

"Я ж былы футбаліст, спартовец, прывыклы да фізічных нагрузак! Ды і не магу сядзець склаўшы рукі", — кажа Сяргей.

## НА ВУЛІЦУ — НА РУКАХ

Штодзённыя фізічныя нагрузкі патрабуюць шмат сіл, але, як кажа Сяргей Осіпаў, яны проста неабходны, каб не толькі трымацца, але і каб на нейкі час забыць пра хваробу.

На свежае паветра Сяргей выходзіць нячаста — Осіпавы жывуць на апошнім паверсе пяціпавярхоўкі. Каб знесці сына, Уладзімір просіць дапамогі ў яго сяброў. На жаль, такія прагулкі бываюць рэдкімі.

"Сябры вывозяць на футбол, калі гуляе наша мясцовая каманда. Я ж сам некалі ў ёй гуляў, — распавядае Сяргей. — Часам на прыроду з сабой бяруць".

## ШАНЦ ЁСЦЬ

Сяргей упэўнены, што ў яго ёсць шанц падняцца на ногі.

"Я чуў, што ў Расіі, у Маскве, робяць аперацыю, пасля якой многія людзі з такім жа дыягназам, як у мяне, могуць рухацца", — кажа Сяргей.

Але на аперацыю патрэбны немалыя сродкі — 20 тысяч долараў, якіх у сям'і Осіпавых няма. І зноў-такі, нягледзячы на ўсё, Сярожа, усміхаючыся, дадае: "Усё будзе добра. Я падымуся".

Я веру — цуды здараюцца.

**ВОЛЬГА ШЫЛА**

# ПА АДПРАЦАВАНАЙ СХЕМЕ

Поспех выбараў залежыць ад таго, хто іх праводзіць. Беларуская рэальнасць – яскравае таму пацвярджэнне.

**МАГІЛЁЎ. ГАЛАСАВАННЕ "ДОМА".**
**Вось што падае назіральнік А.Колчын.**

Магілёўскі ўчастак № 15. Колькасць тых, хто прагаласаваў на ўчастку, складае 450 чалавек. Астатнія (усяго ў спісах тут 2046 чалавек) прагаласавалі "дома". Гэта немагчыма фізічна — абысці такую колькасць дамоў і кватэр, нават маючы 3 скрыні. Пры кожнай з іх, дарэчы, было толькі па адным чалавеку з камісіі.

Магілёўскі ўчастак № 17. На ім прагаласавала 348 чалавек. Усяго ў спісах 2498. Тут было 2 вынасныя скрыні, якія, па звестках камісіі, "справіліся" са сваёй задачай.

**КЛІМАВІЧЫ.**
**Вось што занатаваў назіральнік Сяргей Аржанцаў на ўчастку № 4.**

"На тэрыторыі ўчастка знаходзіцца аграрны каледж. Дырэктар каледжа спадарыня Васільева — старшыня ўчастковай камісіі, а намеснік старшыні і сакратар камісіі — яе падначаленыя. На гэтым участку датэрмінова прагаласавала 37% выбаршчыкаў, што значна больш, чым у сярэднім па краіне. Сярод самых актыўных вызначаліся студэнты, педагогі, мясцовая наменклатура. Шмат было пенсіянераў. Некаторыя з іх перахрэшчвалі скрыню перад тым, як апусціць туды бюлетэнь. У дзень выбараў, 19 снежня, мне паведамілі, што "рашэннем камісіі" я пазбаўлены права назіраць за выбарамі. У якасці прычыны назвалі тое, што быццам бы я распаўсюджваў на ўчастку праграму кандыдата ў прэзідэнты ад БНФ Рыгора Кастусёва. Зразумела, што гэта была хлусня, але сваёй мэты яны дасягнулі. Участак застаўся без незалежнага назірання, а таму абвешчаныя тут вынікі выбараў пад сумневам".

**ГОРКІ. СЕЛЬГАСАКАДЭМІЯ.**
**СТУДЭНЦКІ ЎЧАСТАК № 6.**

На ім датэрмінова прагаласавала амаль 60 адсоткаў выбаршчыкаў.

**ВІКТАР ВОЙТ**

**P.S.** Сярод найбольш "папулярных" метадаў падліку галасоў на ўчастках Магілёўшчыны было адсоўванне на вялікую адлегласць назіральнікаў ад сталоў, на якія высыпаліся і падлічваліся бюлетэні. На многіх участках старшыні не абвяшчалі прысутным канчатковых вынікаў гэтай працэдуры.

# «ВЫБАР» ВЕРНЕЦЦА Ў КАНЦЫ СТУДЗЕНЯ

**Ток-шоу «Выбар», «Выбар плюс», «Адваротны адлік» і іншыя праекты АНТ вернуцца ў эфір у другой палове студзеня,паведаміла прэс-сакратар тэлеканала Таццяна Курбат.**

Яна растлумачыла, што ток-шоу і іншыя дакументальныя праекты АНТ «ідуць у адпачынак у сувязі з навагоднімі святамі».

Да сярэдзіны студзеня іх месца зоймуць навагоднія забаўляльныя праграмы.

Нагадаем, што апошняе ток-шоу «Выбар» выйшла ў эфір 19 снежня і было прысвечана вынікам прэзідэнцкай кампаніі. У ім удзельнічала старшыня Цэнтрвыбаркама Лідзія Ярмошына, якой тэлевядучы Сяргей Дарафееў задаваў пытанні, звязаныя з выбарамі.

Ён, у прыватнасці, запытаўся ў Ярмошынай, ці бачыла яна ролік, у якім у тэхнікуме куратар адной з груп патрабуе ад навучэнцаў з'явіцца на датэрміновае галасаванне, і ці з'яўляецца такая сітуацыя парушэннем заканадаўства. «Так, гэта парушэнне», — заявіла Ярмошына.

«Дык значыць выбары прайшлі з парушэннямі?» — запытаўся Дарафееў. Замест адказу Ярмошына пакінула студыю, заявіўшы, што ў яе няма часу ліберальнічаць, пакуль у ЦВК заблакіраваны людзі (у гэты час на плошчы Незалежнасці, дзе размешчаны офіс ЦВК, праходзіла акцыя пратэсту апазіцыі).

Падчас перадачы тэлевядучы таксама прасіў чыноўнікаў растлумачыць, чаму нельга выходзіць вечарам на плошчу або чаму прадстаўнікоў апазіцыі не дапусцілі дзяжурыць ноччу на выбарчых участках разам з міліцыяй.

20 снежня падчас прэс-канферэнцыі Аляксандр Лукашэнка згадаў пра ток-шоу «Выбор», якое выйшла напярэдадні, назваўшы Сяргея Дарафеева «маладым журналістам, якога трэба паставіць на месца».

> Сяргей Дарафееў: «Любы мой эфір цалкам адпавядае законам Беларусі, і ў гэтых эфірах заўсёды захоўваюцца нормы журналісцкай этыкі..»

Пасля гэтага ў інтэрнэце з'явілася інфармацыя аб звальненні тэлевядучага, аднак пазней яе абвергла прэс-служба АНТ.

Сам Дарафееў, каментуючы чуткі інтэрнэт-газеце Naviny.by («Белорусские новости»), заявіў: «Кажучы пра мой статус, магу заявіць, што ён не змяніўся — я як з'яўляўся супрацоўнікам АНТ, так і з'яўляюся. Што будзе далей, я не ведаю. Гэта пакуль уся інфармацыя, якую я магу сказаць».

Пры гэтым тэлевядучы падкрэсліў: «Любы мой эфір цалкам адпавядае законам Беларусі, і ў гэтых эфірах заўсёды захоўваюцца нормы журналісцкай этыкі, калі ўсім бакам даюцца аднолькавыя рэсурсы — незалежна ад тэмы і ўдзельнікаў».

**ТАЦЦЯНА ДАРАШЧОНАК, БЕЛАПАН**

# ШТО МОЖНА ПАБАЧЫЦЬ ЦЯПЕР У МІРСКІМ ЗАМКУ

## На днях ў Мірскім замку адкрылася 39 новых экспазіцыйных залаў.



Наведвальнікі, якім пашчасціла ў гэты дзень трапіць у замак, акрамя ўжо дзеючай Паўднёва-заходняй вежы і капліцы-пахавальні князёў Святаполк-Мірскіх, маглі ўбачыць Паўночны корпус, Цэнтральную, Паўночна-ўсходнюю і Паўночна-заходнюю вежы.

Новыя экспазіцыі прысвечаны былым уладальнікам замка, а таксама войнам, якія ў розныя часы адбываліся на беларускіх землях. У некаторых залах рэканструіраваны першапачатковы інтэр'ер.

**TIO.BY**

**8 10 370 672 829 35**

**Каб аформіць падпіску "Тут і цяпер"**

трэба адправіць смс са сваім адрасам на гэты нумар

**падпіска на газету "Тут і цяпер" - БЯСПЛАТНАЯ**

**Заснавальнік** ТАА "Тут і цяпер" **Адрас** г. Мінск, вул. Касцюшкі, 18
**Галоўны рэдактор** А. Уласаў (email: info@svabodaby.net) **Падпісана ў друк** 22:45 23.12.10
Тыраж 299 экзэмпляраў